«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мікіце Самарыну, які падчас пратэстаў заступіўся за азотаўца, прызначылі новае пакаранне

25.03.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Мікіта Самарын на волі

Мікіце Самарыну 25 сакавіка ў Гродзенскім абласным судзе прызначылі новае пакаранне — два з паловай гады пазбаўлення волі замест чатырох гадоў «хіміі».

Па інфармацыі hrodna.life, справу 23 сакавіка разгледзела судовая калегія ў складзе суддзяў **Андрэя Ліхача, Уладзіміра Яўхуты і Валерыя Раманоўскага** і вынесла рашэнне 25 сакавіка.

Суму кампенсацыі пацярпеламу амапаўцу **Білідзе** павялічылі - з 500 да 2000 рублёў.

Сам Мікіта ў суд не з'явіўся. Ён накіраваў ліст праз сябра. У ім ён распавёў, што паводле яго інфармацыі, у зале суду планавалі адвольныя затрыманні, што пагражала яму і прысутным. У будынку суда сапраўды знаходзіліся сілавікі.

Як ішоў разгляд справы

Мікіта 23 сакавіка хадайнічаў аб пераносе пасяджэння ў сувязі з амбулаторным лячэннем. Таксама ён хацеў адмовіцца ад адваката, бо планаваў абараняць сябе сам. «У мяне няма даверу да гэтага абаронцы. Яна не можам прадстаўляць мае інтарэсы — мы нават не размаўлялі з нагоды справы», — сказаў Мікіта. Адвакат падтрымала хадайніцтва, пракурор палічыла довады неабгрунтаванымі. Суд хадайніцтва не задаволіў.

Справа Мікіты Самарына

Мікіту Самарына, якога абвінавачвалі ў распыленні газу ў твар амапаўцу 25 жніўня паводле арт. 364 КК, асудзілі 11 снежня на чатыры гады абмежавання волі ў папраўчай установе адкрытага тыпу. Самарын таксама абавязаны выплаціць 500 рублёў кампенсацыі маральнай шкоды супрацоўніку АМАП. Мікіту вызвалілі ў зале суда — змянілі меру стрымання на падпіску аб нявыездзе.

Пасля затрымання 5 кастрычніка Мікіту Самарына кінулі ў мікрааўтобус у кайданках, зацягнутых вышэй кісцяў на запясце — у яго засталіся шнары ад рэзаных ран. Прама ў аўтобусе Самарыну нажом абрэзалі доўгія валасы. У Галоўным упраўленні па арганізаванай злачыннасці яму загадалі даць паказанні пад пагрозай вывезці ў лес і завядзеннем крымінальнай справы на затрыманага з ім сябра.



Чатыры гады "хіміі" гарадзенскаму аўтарэстаўратару Мікіту Самарыну

Суддзя Хіхол абвесціў прысуд - чатыры гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу. Апроч таго, Самарын павінен выплаціць пацярпеламу 500 рублёў грашовай кампенсацыі.

Пракурор: прысуд занадта мяккі

Прысуд варта змяніць, таму што ён занадта мяккі, пакаранне не адпавядае цяжару злачынства і асобе абвінавачанага, распавяла ў судзе пракурор. Суд не ўлічыў ступень грамадскай небяспекі злачынства. На думку пракурора, Самарын свядома падвышаў узровень напружанасці ў грамадстве, распальваў нянавісць да супрацоўнікаў УУС, дэстабілізаваў палітычную абстаноўку ў краіне, падрываў аўтарытэт улады.

Пракурор прапанавала прызначыць Самарыну чатыры гады турмы і заключыць яго пад варту.

Суд не ўлічыў характар прычыненых пацярпеламу амапаўцу Білідзе фізічных і маральных пакут. Яму варта выплаціць не 500, а 2000 рублёў, лічыць пракурор.

Самарын: прысуд незаконны

Мікіта прысуд палічыў незаконным, папрасіў яго адмяніць і накіраваць на перагляд у суд першай інстанцыі з іншым складам суддзяў альбо альбо вярнуць у пракуратуру на даследаванне.

Суд не ўлічыў фізічны і псіхалагічны стан Самарына пры затрыманні, лічыць ён. Па яго словах, яму пагражалі і шантажавалі. Мікіта адзначыў, што міліцыянты перавысілі паўнамоцтвы, што пацвярджаецца медаглядам і звесткамі сябра, якога затрымалі разам з ім. Па гэтых фактах Мікіта звяртаўся ў Галоўнае ўпраўленне ўласнай бяспекі МУС РБ, Галоўнае ўпраўленне СК, Галоўнае ўпраўленне КДБ, Савет Бяспекі, Генеральную пракуратуру РБ, Адміністрацыю прэзідэнта РБ. Заявы адусюль накіравалі на разгляд ва Ўпраўленне СК Гродзенскай вобласці. 5 студзеня 2021 года Мікіце адмовілі ў распачынанні крымінальнай справы.

Пацярпелы амапавец Біліда 25 жніўня пры першасным звароце да медыкаў сказаў, што сам распыліў сабе газ у вочы, распавёў Самарын, спасылаючыся на матэрыялы справы. Пазней ён падаў заяву аб атрыманні цялесных пашкоджанняў пры службе.

Суд не ўлічыў паказанні сведак, якія давалі паказанні на карысць Самарына, а некаторыя сведкі прысутнічалі на судовым разглядзе да дачы паказанняў, сцвярджае гродзенец. Тэлефон Мікіты, які нібыта вярнулі маці, яна не атрымала, успомніў Самарын.

Твитнуть





"Тое, што зрабіў Раман Бандарэнка — гэта выбар асобы". Сведчанні ўдзельнікаў акцыі памяці на Плошчы Пераменаў

"Раман у дваццатым калене, выходзь!" Памяці Рамана Бандарэнкі

Футбольнага трэнера мінскага "Дынама" асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Агляд навінаў палітвязняў з 27 лістапада па 5 снежня

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

"Медыцына ў турме – чорнае люстэрка, у якое заглянуў кожны з нас"

Агляд навінаў палітвязняў з 17 па 27 лістапада



ГАЛОЎНАЕ

"Я думаў, што ў ШІЗА проста падохну". Гісторыя былога палітвязня па "справе байкераў"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Задушанае інфармацыйнае асяроддзе і татальны кантроль над грамадствам". Гаворым з праваабаронцам аб праблемах і рэаліях выбараў*

Праваабаронца "Вясны" на канферэнцыі АБСЕ заклікаў падтрымліваць грамадзянскую супольнасць Беларусі ў выгнанні

Агляд навінаў палітвязняў з 27 лістапада па 5 снежня

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Мінскага менеджэра-эканаміста асудзілі да двух гадоў калоніі за ўдзел у акцыі пратэсту і нібыта за "траву"

Сітуацыя напярэдадні выбараў*2024. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" (дакумент)

Затрыманні, папаўненне спісу "экстрэмісцкіх" матэрыялаў: хроніка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Кастрычнік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY